*Аліна Самохіна*

# ТЭМА «СІРАТЫ» Ў ПРАЦАХ ДАСЛЕДЧЫКАЎ БЕЛАРУСКАЙ ТРАДЫЦЫЙНАЙ КУЛЬТУРЫ Ў ПАЧАТКУ ХХ СТ.

На навукова-культурны стан у пачатку ХХ ст. у Беларусі аказала ўплыў палітыка нацыянальна-дзяржаўнага і нацыянальна-культурнага самавызначэння. Гэты перыяд характарызуецца імкненнем да вывучэння культуры і мовы. Неадрыўным ад гэтых працэсаў з'яўляецца і развіццё фалькларыстыкі і этнаграфіі. У многіх навуковых працах названага перыяду была прадстаўлена тэма «сіраты».

Разгляд прац навукоўцаў 1900–1920 гг., якія закраналі тэму сіроцтва ў беларускім фальклоры і этнаграфіі, дазваляе вызначыць месца гэтай тэмы ў працэсе развіцця навуковых даследаванняў.

Праца «Даследаванні і артыкулы. Этнаграфія і сацыялогія, звычаёвае права, статыстыка, беларуская пісьменнасць» гісторыка і этнографа М.В.Доўнар-Запольскага з'яўляецца адной з першых навукова-абгрунтаваных даследаванняў Беларусі як самабытнай краіны са сваёй арыгінальнай культурай і мовай. У кантэксце праблемы, якую мы разглядаем, асабліва каштоўным з'яўляецца этнаграфічна-краязнаўчы аналіз становішча поўных сірот, удавы і яе дзяцей, прымака-сіраты, прыёмных дзяцей у Беларусі [4]. Сярод гэтых тэкстаў сустракаецца рэдкае ў крыніцах таго часу ўпамінанне аб прыёмных дзяцях: «Прымаюць беларусы прыёмышаў вельмі ахвотна, асабліва падлеткаў, нават шматсямейныя. З аднаго боку спадзяюцца на яго працоўную сілу, з другога – прыём сіротаў складае маральны абавязак заможнага селяніна, асабліва родзіча сіраты. Прымусіць узяць можа нават грамадства або родзічы» [4, с. 40].

У трохтомным даследаванні акадэміка Я.Ф.Карскага «Беларусы» дадзена ўсебаковае навуковае абгрунтаванне нацыянальнай самабытнасці беларусаў. У першай кнізе трэцяга тома «Очерки словесности белорусского племени» змешчана вялікая колькасць песень, якія прысвечаны тэме сіроцтва. Большая частка гэтых фальклорных твораў адносіцца да сямейнай абраднасці. Сярод сіроцкіх вясельных песен асаблівую цікавасць выклікаюць тыя, якія выконваліся на дзявоцкі вечар і перад шлюбам або пасля яго. Акрамя таго, у кнізе змяшчаецца шмат галашэнняў, якія выконваліся сіротамі і якія насычаны шматлікімі эпітэтамі і сімваламі. Цікавыя сюжэты, звязаныя з вобразам сіраты, раскрываюцца праз пазаабрадавыя песні, якія адносяцца да салдацкіх і любоўных. Даволі рэдкія матывы, звязаныя з сіратой, раскрываюцца праз балады: дзяўчына-сірата ў турэцкім палоне, сястра ў палоне братоў-разбойнікаў. Духоўныя вершы, змешчаныя ў працы аўтара, таксама раскрываюць тэму сіроцтва. Духоўны верш «Иосиф Прекрасный» апавядае пра галоўнага героя-сірату [5].

Культурны беларуска-польскі дзеяч Я.Баршчэўскі закранаў пытанні, звязаныя са стаўленнем да пазашлюбных дзяцей (паўсірот) у сваёй працы «Białoruska obrzędowość i folklore wshodniej Białostoczyny». Гэта этнаграфічнае апісанне – адно з адзінкавых, занатаваных да пачатку ХХ ст. Прывядзём невялікі ўрывак з яго: «У беларускай супольнасці не толькі даўней, але і сёння асяроддзе мае адмоўнае стаўленне да пазашлюбных дзяцей. Пагардліва вызначаючы іх: байструк, падкідыш, бахура. Адмоўнае стаўленне да дзяцей, народжаных па-за шлюбам, звычайна захоўваецца да іх паўналецця» [1, с. 20]. Акрамя таго, у гэтай працы змешчаны фальклорныя апісанні вясельных абрадаў. Асаблівая ўвага надаецца фальклору, прысвечанаму нявесце-сіраце [1].

Уяўленні пра сірату ў беларусаў былой Смаленскай губерні прадстаўлены ў фальклорных творах, якія змяшчаюцца ў «Смоленским этнографическим сборнике» У.М.Дабравольскага. У чацвёртай частцы гэтай працы аўтарам размешчаны песні, якія прадстаўляюць каляндарную і пазаабрадавую паэзію беларусаў. У гэтых тэкстах асноўны персанаж – сірата [3].

Неабходна адзначыць фальклорна-этнаграфічныя працы, выдадзеныя пад рэдакцыяй Е.Р.Раманава, у тэкстах якіх часта закранаецца тэма «сіраты». У трэцім выпуску «Могилёвская старина. Сборник статей «Могилёвских Губернских Ведомостей»» змяшчаюцца цікавыя па сваім сюжэце вясельныя сіроцкія песні, запісаныя ў вёсцы Высокае Аршанскага павета [8, с. 78, 79]. У другое выданне «Материалов по этнографии Гродненской губернии» ўвайшоў песенны фальклор, паданні і казкі, у якіх прадстаўлены вобраз сіраты. Тэксты запісаны ў розных паветах былой Гродзенскай губерні [7].

Тэма сіроцтва сустракаецца ў тэкстах песен, выдадзеных С.А.Малевічам у працы «Белорусские народные песни». Яны размешчаны ў раздзелах летняй, любоўнай, вясельнай, сямейнай і жартоўнай паэзіі. Тэксты былі зафіксаваны аўтарам у Мінскай губерні Слуцкага павета Ланьской воласці ў вёсках Малева, Альхоўка, Карцэвічы, Яськевічы і Гусакі [6]. Пісьменнік і фальклярыст А.Р.Пшчэлка ў сваім мастацкім творы «Микитовы хаутуры. Очерк из белорусской жизни» апісаў пахавальны абрад і змясціў у ім галашэнні дачкі па бацьку. Даследчыкі яго творчасці адзначаюць, што фальклорныя і этнаграфічныя звесткі аўтар перадаваў у сваіх творах у нязменным выглядзе такімі, якімі ён іх пачуў [9].

Песні, у якіх раскрываецца тэма «сіраты» ў беларускай традыцыйнай культуры, змешчаныў працы І.Я.Бычко-Машко «Сборник народных песен, записанных в посёлке Калюга-Камарно Рогозянской волости Кобринского уезда Гродненской губерни». Песні, сабраныя аўтарам, адносяцца да пазаабрадавага фальклору і маюць цікавыя і рэдкія сюжэты [2].

Фалькларыст і археолаг І.А.Сербаў сваю працу «Белорусы-сакуны. Краткий этнографический очерк» прысвяціў фальклору насельніцтва Верхняга Палесся (мяжа былога Ігуменскага і Бабруйскага паветаў Мінскай губерні). Асобнае месца ў гэтым даследаванні адведзена старажытным легендам і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

паданням, якія размяшчаюцца ў радзеле «Старинные рассказы (легенды)». Сярод фальклорных твораў, змешчаных тут, неабходна вылучыць легенду пра ўзнікненне мядзведзя. Згодна з сюжэтам, гэта жывёла ўзнікла праз «галуза-безбацькавіча», які дражніў Бога са «святцамі». У каляндарна-абрадавым песенным фальклоры, занатаваным аўтарам, змешчана жніўная песня, якая перадае перажыванні маладой удавы і яе дзяцей [10, с. 153,154; 179,180].

Падводзячы вынік, неабходна адзначыць, што тэма сіроцтва ў працах навукоўцаў пачатку XX ст. займала значнае месца. Вобраз сіраты сустракаецца ў фальклорных тэкстах і этнаграфічных запісах. У фальклорных працах прадстаўлены пераважна песні, звязаныя з сіратой. У навуковы зварот былі ўведзены паданні, духоўныя вершы і казкі, сюжэт якіх звязаны з вобразам сіраты. У працы «Даследаванні і артыкулы» М.В.Доўнар-Запольскага тэма «сіраты» ўпершыню становіцца адным з цэнтральных аб’ектаў даследавання. Такім чынам, магчыма прыйсці да высновы, што тэма сіроцтва раскрывае самабытнасць традыцыйнай беларускай культуры, яна развівалася і заняла важнае месца ў навуковых даследаваннях пачатку XX ст.

**Спіс літаратуры:**


1. Barszczewski, A. Białoruska obrzędowość i folklore wshodniej Białostoczyny / A. Barszczewski. – Białystok : Sekcja naukowa ZG BTSK, 1900. – 175 s.
2. Бычко-Машко, И. Е. Сборник народных песен, записанных в посёлке Калюга-Комарно Рогозянской волости Кобринскго уезда Гродненской губернии / И. Е. Бычко-Машко. – СПб. : Типогр. Импер. акад. наук, 1911. – 61 с.
3. Добровольский, В. Н. Смоленский этнографический сборник : в 4 ч. / В. Н. Добровольский. Ч. 4 : 1891–1903. – М. : Типогр. А. В. Васильева, 1903. – 720 с.
4. Довнар-Запольский, М. В. Исследования и статьи. Этнография и социология, обычное право, статистика, белорусская письменность / М. В. Довнар-Запольский. – Киев : Изд. А. П. Сапунова, 1909. – 491 с.
5. Карский, Е. Ф. Белорусы : 1903–1921 : в 3 т. / Е. Ф. Карский. Т. 3, ч.1. : Очерки словесности белорусского племени. Народная поэзия. – М. : Типолит. И.Н. Кушнерев и К°, 1916. – 557 с.
6. Малевич, С. Белорусские народные песни / С. Малевич. – СПб. : Типогр. Импер. Акад. наук, 1907. – 194 с.
7. Материалы по этнографии Гродненской губернии : в 2 в. / под ред. Е. Р. Романова. – Вильно : Изд-ие Упр. Вилен. учеб. округа, 1911–1912. – Вып. 2. – 1912. – 396 с.
8. Могилёвская старина : сб. ст. «Могилёвских губернских ведомостей» : в 3 вып. / под ред. Е. Р. Романова. – Могилёв : Тип. Губерн. прав-ия, 1900 –1903. – Вып. 3. – 1903. – 127 с.
9. Пщелка, А .Р. Микитовы хаутуры : очерк из белорусской жизни / А. Р. Пщелко. – 2-е изд. – Витебск : Тип. П. А. Подземского, 1910. – 53 с.
10. Сербов, И. А. Белорусы-сакуны : краткий этнографический очерк / И. А. Сербов. – СПб. : Тип. Импер. акад. наук, 1915. – 180 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ